Прэзентацыя падрыхтавана І. Я. Андрэевай

# Мая рэспубліка

Мая Радзіма — Беларусь
4 клас

Образовательная компания «Содействие»

**МЭТА:** даць агульнае ўяўленне пра палітычную сістэму дзяржавы і яе знешнюю палітыку.

**ЗАДАЧЫ:**

— паказаць этапы станаўлення Рэспублікі Беларусь як незалежнай і самастойнай дзяржавы і паступовае ўваходжанне яе ў склад Садружнасці Незалежных Дзяржаў і ў саюз з Расіяй;

— пазнаёміць з органамі дзяржаўнай улады і органамі дзяржаўнага кiравання і функцыямі, якія яны выконваюць;

— даць уяўленне пра Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь;

— развіваць першапачатковыя ўяўленні аб дзяржаўнасці; фарміраваць актыўную жыццёвую пазіцыю;

— выхоўваць паважлівыя адносіны да органаў дзяржаўнай улады і законаў, імкненне да добрых зносін з нашымі суседзямі і іншымі народамі свету.

Образовательная компания «Содействие»

# Праверка дамашняга задання

## Гульня «Хто лепш ведае сталіцу нашай краіны — Мінск»

**Па 1 балу за кожную правільную назву**

Образовательная компания «Содействие»

**Заданне 1.**

*Мінск — гэта...*

1) Сталіца Рэспублікі Беларусь;
2) самы старажытны горад Беларусі;
3) «Горад-герой»;
4) адзін з самых прыгожых гарадоў Беларусі.

**Заданне 2.**

*Назавіце даты.*

Бітва на Нямізе.
***1067 г.***

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны.
***22 чэрвеня 1941 г.***

Першае летапіснае ўпамінанне пра Мінск.
***1067 г.***

Вызваленне Мінска ад фашыстаў.
***3 ліпеня 1944 г.***

Образовательная компания «Содействие»

**Заданне 3.**

*Якую плошчу г. Мінска называюць галоўнымі «варотамі горада»?*

**Прывакзальную плошчу.**

*Якая плошча г. Мінска з'яўляецца галоўнай і самай вялікай?*

**Плошча Незалежнасці.**

**Заданне 4.**

*Які праспект з'яўляецца галоўнай магістраллю г. Мінска?*

**Праспект Незалежнасці.**

*Уздоўж якога праспекта размешчана больш за ўсё ўстаноў і прадпрыемстваў?*

**Уздоўж праспекта Незалежнасці.**

Образовательная компания «Содействие»

**Заданне 5.**

*Якія будынкі знаходзяцца на плошчы Незалежнасці?*

*Якія будынкі знаходзяцца на Кастрычніцкай плошчы?*

***Дом урада, БДзУ, педагагічны ўніверсітэт.***

***Палац Рэспублікі, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.***

**Заданне 6.**

*Колькі жыхароў налічваецца ў г. Мінску?*

*Колькі беларускіх вайскоўцаў загінула ўчас вайны ў Афганістане?*

***Каля 1 726 300 жыхароў.***

***771 чалавек.***

Образовательная компания «Содействие»

## Заданне 7.

*Каму прысвечаны помнікі на «востраве смутку і слёз»?*

**Беларускім грамадзянам, загінуўшым у замежных канфліктах і войнах.**

*Каму прысвечаны абеліск на плошчы Перамогі?*

**У гонар перамогі над ворагам у гады Вялікай Айчыннай вайны і ў памяць аб загінуўшых.**

## Заданне 8.

*Якім ордэнам упрыгожаны абеліск Перамогі?*

**Ордэнам Перамогі.**

*Чаму на плошчы Перамогі запалены Вечны агонь?*

**У памяць аб загінуўшых.**

Образовательная компания «Содействие»

**Заданне 9.**

*Што сімвалізуе меч у падножжа абеліска Перамогі?*

***Перамогу над ворагам.***

*Што сімвалізуюць 4 бронзавыя вянкі вакол абеліска Перамогі?*

***4 франты, што вызвалялі Беларусь.***

**Заданне 10.**

*Назавіце герояў, скульптуры якіх размешчаны побач з помнікам Я. Коласу на плошчы яго імя.*

Аповесць «Дрыгва».

***Дзед Талаш і яго сын Панас.***

Паэма «Сымон-музыка».

***Сымон і Ганна.***

# Растлумачце паняцці.

| Паняцце | Ведаю | Не ведаю |
|---|---|---|
| Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь | | |
| Прэзідэнт | | |
| Урад | | |
| Арганізацыя Аб’ яднаных Нацый (ААН) | | |
| Садружнасць Незалежных Дзяржаў | | |
| грамадзяне | | |

# План урока

1. Садружнасць Незалежных Дзяржаў (СНД).
2. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.
3. Прэзідэнт і Урад.
4. Адносіны з іншымі дзяржавамі.
5. Саюз Беларусі і Расіі.

Образовательная компания «Содействие»




У снежні 1991 г. спыніў сваў існаванне СССР.

1. Успомніце і назавіце дату ўтварэння СССР.




***1922 г. — стварэнне СССР.***

2. Падлічыце, колькі гадоў праіснаваў СССР.

***1991 – 1922 = 69 г.***

Образовательная компания «Содействие»



**Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь** — галоўнае свята беларускай дзяржаўнасці — святкуецца штогод **3 ліпеня**.

3 ліпеня 1944 года адбылося таксама вызваленне сталіцы Беларусі, Мінска, ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Рашэнне аб святкаванні Дня Незалежнасці 3 ліпеня, у дзень вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, было прынята ў ходзе рэспубліканскага рэферэндуму ў 1996 годзе.

Галоўнае мерапрыемства Дня Незалежнасці — урачысты ваенны парад. Ён нагадвае пра тое, што беларускі народ цаной неймаверных страт заваяваў свабоду і незалежнасць Радзімы і ў далейшым не паступіць сваёй незалежнасцю.

Образовательная компания «Содействие»





У 1991 г. была абвешчана незалежная і самастойная дзяржава — Рэспубліка Беларусь.

Образовательная компания «Содействие»

У 1991 г. наша краіна ўвайшла ў склад Садружнасці Незалежных Дзяржаў — СНД. На экране вы бачыце эмблему гэтай арганізацыі.

Образовательная компания «Содействие»

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь**




***15 сакавіка 1994 г.*** была прынята першая Канстытуцыя незалежнай Рэспублікі Беларусь — асноўны Закон нашай краіны. Сучасная Канстытуцыя была скарэкціравана ў 1996 і 2004 гадах. Гэта пятая Канстытуцыя ў гісторыі Беларусі.

Образовательная компания «Содействие»



Тэкст асноўнага Закона нашай дзяржавы пачынаецца словамі: ***«Мы, народ Рэспублікі Беларусь…»***. У гэтых словах гучыць гордасць за нашу краіну, за яе багатую шматвекавую гісторыю, за наш народ, які тварыў гэтую гісторыю, будаваў беларускую дзяржаўнасць, а цяпер з'яўляецца гаспадаром свайго і яе лёсу.

Образовательная компания «Содействие»




**Артыкул 2.**

***Чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з’яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы.***

Образовательная компания «Содействие»



Кіраўніком нашай дзяржавы, згодна з Канстытуцыяй, з’яўляецца Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 79**

***Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з’яўляецца кіраўніком дзяржавы,***
***гарантам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь,***
***правоў і свабод чалавека***
***і грамадзяніна.***

У 1994, 2001, 2006 гадах на гэтую пасаду ў выніку ўсенароднага галасавання быў абраны **Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка**.

Образовательная компания «Содействие»



## Як выбіраецца Прэзідэнт?

Беларускі Прэзідэнт непасрэдна выбіраецца народам Беларусі **на 5 гадоў**.

Кожны беларус ва ўзросце ад 18 гадоў можа прымаць удзел у галасаванні.

Кандыдат у Прэзідэнты павінен быць:

- **старэйшы за 35 гадоў**;
- **пражываць у Беларусі** на працягу як **мінімум 10 гадоў**.

Образовательная компания «Содействие»

# Паўнамоцтвы Прэзідэнта

Акрамя пасады кіраўніка дзяржавы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з'яўляецца:

- галоўнакамандуючым **Узброенымі Сіламі Беларусі**;
- кіраўніком **Савета Бяспекі**;
- **гарантам Канстытуцыі** Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт таксама адказвае за:

- **суверэнітэт** Рэспублікі Беларусь;
- **нацыянальную бяспеку**;
- **тэрытарыяльную цэласнасць**;
- **палітычную і эканамічную** стабільнасць.

Образовательная компания «Содействие»



Парламент Беларусі называецца **Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь.** З'яўляецца органам прадстаўнічай і заканадаўчай улады Рэспублікі Беларусь.

**Парламент Беларусі** складаецца з дзвюх Палат:

1. **Палата прадстаўнікоў.**
2. **Савет Рэспублікі.**

Палата прадстаўнікоў штогод праводзіць па 2 чарговыя сесіі. **Пазачарговыя сесіі** склікаюцца па ініцыятыве Прэзідэнта краіны.

**У Беларусі Парламент выбіраецца тэрмінам на** 4 гады.

Образовательная компания «Содействие»

## Палата прадстаўнікоў

У складзе Палаты прадстаўнікоў **110 дэпутатаў**, якія выбіраюцца народам Беларусі. Дэпутаты павінны быць грамадзянамі Беларусі ва ўзросце ад 21 года. Яны могуць быць членамі ўрада, але не могуць у той жа час працаваць у Савеце Рэспублікі.



Функцыі **Палаты прадстаўнікоў**:

- **разгляд праектаў законаў**;
- назначэнне **выбараў Прэзідэнта**;
- адабрэнне кандыдатаў, якія назначаюцца Прэзідэнтам на пасаду **Прэм’ер-міністра**;
- **ацэнка работы ўрада**;
- ініцыяцыя **вотумаў недавер’я**, калі гэта неабходна.

Образовательная компания «Содействие»



## Савет Рэспублікі

Савет Рэспублікі — гэта **рэгіянальны прадстаўнічы орган**, які складаецца з 64 членаў.

Мясцовыя Саветы выбіраюць 56 членаў: 8 ад кожнай вобласці і 8 ад Мінска. Яшчэ 8 членаў назначае Прэзідэнт Беларусі.

Кандыдаты ў члены Савета Рэспублікі павінны:

- быць ва ўзросце ад **30 гадоў**;
- **пастаянна пражываць** у адпаведным рэгіёне Беларусі не менш за **5 гадоў**.

Асноўная функцыя Савета Рэспублікі — **прыняцце або адхіленне праектаў законаў**, адобраных Палатай прадстаўнікоў.

Образовательная компания «Содействие»



## Урад Беларусі

У склад беларускага ўрада, або **Савета Міністраў,** уваходзяць прэм’ер-міністр Беларусі, яго намеснікі, міністры, якія ўзначальваюць адпаведныя міністэрствы, а таксама кіраўнікі дзяржаўных камітэтаў.

Урад **падсправаздачны Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь** і **адказны перад Парламентам**.

Прэм’ер-міністр назначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь са згоды Палаты прадстаўнікоў.

Паўнамоцтвы ўрада рэгулююцца **Канстытуцыяй** Рэспублікі Беларусь.

Образовательная компания «Содействие»



На пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў.

Образовательная компания «Содействие»

# Дзейнасць урада Беларусі

Савет Міністраў Беларусі адказвае за работу **дзяржаўных органаў**, у ліку якіх:

- дзяржаўныя адміністрацыйныя органы;
- міністэрствы;
- дзяржаўныя камітэты;
- канцэрны;
- арганізацыі, падпарадкаваныя ўраду.

У кампетэнцыю ўрада ўваходзяць:

- кантроль над **нацыянальным бюджэтам**;
- **унутраная і знешняя** палітыка;
- праграмы **эканамічнага і сацыяльнага развіцця**;
- **нацыянальная бяспека і абарона**.

Образовательная компания «Содействие»



**Прэм’ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі**

Образовательная компания «Содействие»



На фота — будынак Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь

**Судовая сістэма Беларусі — Канстытуцыйны Суд, суды агульнай юрысдыкцыі і эканамічныя суды.**
Згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь судовая ўлада ў краіне належыць судам.

Судовая сістэма складаецца з 3 асноўных груп:

- суды **агульнай юрысдыкцыі**;
- **эканамічныя** суды;
- **Канстытуцыйны** Суд.

**Усе судовыя разборы праводзяцца ва ўстаноўленым парадку. Утварэнне надзвычайных судоў забараняецца.**

Образовательная компания «Содействие»



Канстытуцыйны Суд забяспечвае вяршэнства Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і яе непасрэднае дзеянне, ажыццяўляе канстытуцыйны кантроль нарматыўных прававых актаў дзяржаўных органаў, зацвярджае законнасць у нарматворчасці і правапрымяненні. Пры гэтым адной з галоўных задач Канстытуцыйнага Суда была і застаецца абарона канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян.

Образовательная компания «Содействие»



З 1991 г. Рэспубліка Беларусь — незалежная дзяржава. Яе назалежнасць прызналі іншыя краіны свету і ўстанавілі сувязі з нашай краінай.

Аўтарытэт нашай дзяржавы вельмі вялікі ва ўсім свеце, найперш за ўсё таму, што яна з'яўляецца адной з заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН).

Образовательная компания «Содействие»



Яшчэ больш аўтарытэт нашай краіне прынесла добраахвотная адмова ад ядзернай зброі. Беларусь першая ў свеце вывела гэтую зброю са сваёй тэрыторыі.




Самым надзейным суседам Беларусі з'яўляецца Расія.

***2 красавіка 1997 г. створаны Саюз Беларусі і Расіі.***

У снежні 1999 г. быў падпісаны ***Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы.***






***2 красавіка*** — Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі.